# Беластоцкая дэмакратыя зблізку

Што б ні гаварыць пра зьмены ў Польшчы, яны вялікія. Адной з асноваў гэтых зьменаў была самаўрадавая рэформа, у выніку якой мясцоваму самакіраваньню перададзеная была частка кампэтэнцыяў дзяржаўнай адміністрацыі. І хаця гэтая частка была не такая вялікая, усё–такі самаўрады здолелі сябе праявіць у дзеяньні за апошнія чатыры гады і могуць цяпер дзяліцца сваім досьведам зь іншымі.

У тым, што ёсьць што пераймаць ад польскіх самаўрадаўцаў, пераканалася група беларускіх дэпутатаў, навукоўцаў і журналістаў з Горадні, Віцебску і Магілёва, якая пабывала ў Беластоку з 15 па 21 чэрвеня. Іхную паездку зь беларускага боку арганізаваў Фонд імя Льва Сапегі, які займаецца падтрымкай дэмакратычных рэформаў у Беларусі, а з польскага — Фонд разьвіцьця лякальнай дэмакратыі, а канкрэтна — яго Цэнтар навучаньня ў Беластоку. Спонсарам усяго мерапрыемства быў Фонд імя Стэфана Баторыя, які займаецца распаўсюджваньнем ідэяў дэмакратычнага грамадзтва ва ўсёй Цэнтральна–Ўсходняй Эўропе.

Беларускія госьці за некалькі дзён правялі шмат візытаў і сустрэчаў, знаёмячыся з працай Гміннай рады і Ўправы ў Супрасьлі, Гарадзкой рады і Ўправы ў Беластоку ды Самаўрадавага сэйміку Беласточчыны і Ваяводзкай управы, а таксама з больш спэцыялізаванымі ўстановамі, як Ваяводзкая выбарчая камісія і Рэгіянальная разьліковая палата.

Нялёгка было гасьцям разабрацца ў дзейнай у Польшчы самаўрадавай сыстэме і яе суадносінах з апаратам дзяржаўнай улады, але ўсё–такі, сустрэча за сустрэчай, узьнікаў у іхных вачах вобраз мясцовага самакіраваньня, яго посьпехаў і паразаў. Перш за ўсё, думаю, стала для іх зразумела, што сыстэма самакіраваньня толькі будуецца, шляхам спробаў і памылак ды няспынных зьменаў. Тым ня менш, агульны посьпех самаўрадаўцаў настолькі відавочны, што гаспадары ня мусілі спэцыяльна паказвацца перад гасьцямі.

Усе прадстаўнікі самаўраду падкрэсьлівалі, што выбары, за ходам якіх наглядала беларуская дэлегацыя, наведваючы ў нядзелю выбарчыя ўчасткі, зьяўляюцца для іх сапраўдным паказчыкам вынікаў іхнай працы. Тое самае гаварылі і пераможцы, і пераможаныя. Найбольш упэўнены ў сваім посьпеху быў бурмістар Супрасьлі, як аказалася, слушна. У нядзелю выбаршчыкі прагаласавалі за яго гуртам. Гэта сьведчыць пра тое, што выбаршчыкі не такія ўжо падатлівыя на пустазвонства і ўмеюць ушанаваць добрага гаспадара.

Госьці зь Беларусі пазнаёміліся таксама зь “Нівай” і БГКТ. Якраз знаёмства з рэальнай сытуацыяй беларускай меншасьці ў Беластоку стала для некаторых зь іх, якія прыехалі сюды з усходняй Беларусі, нечым зусім нечаканым. У іх вачах трэснуў міт, што быццам бы “сапраўны беларус жыве ў Беластоку”. Хапіла паглядзець мізэрныя варункі, у якіх працуюць тут беларускія ўстановы. Такім чынам, маглі яны пераканацца, што мясцовая дэмакратыя праблемаў нацыянальнай меншасьці якраз ня вырашыла. Усё–такі, думаю, што станоўчы бок дасьведчаньня намнога важнейшы за адмоўны. Хацелася б, каб як найбольш беларускіх грамадзкіх дзеячоў пабачыла, што ня так ужо страшна быць самому сабе гаспадаром. Каб толькі Вялікаму спонсару, спадару Сорасу, грошай хапіла…

*Друкуецца паводле:*
Ніва. 1994. 10 ліпеня. № 28. С. 5.